# КУЛЬТУРНАЕ САМАВЫЯЎЛЕННЕ АСОБЫ Ў ВІРТУАЛЬНАЙ ПРАСТОРЫ

***А. Д. Крывалап,***
*кандыдат культуралогіі, дактарант кафедры культуралогіі*
*Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў*

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

У кожнага з нас ёсць месца, якое з'яўляецца нашым домам, якое мае асаблівы сэнс для нас. Гэта не проста сцены, столь і падлога, а нешта значна большае. На сённяшні дзень значную колькасць свайго жыцця мы праводзім у віртуальнай прасторы, а ці маем мы магчымасць казаць пра віртуальны дом? Ці будуць выконваць функцыю дому нашы профілі ў сацыяльных сетках?

Мы не ставім мэтай пераказаць аптымістычную гісторыю аб тым, якім чынам мы можам далучыцца да скарбаў сучаснай сусветнай культуры, не выходзячы з дому ў рэжыме анлайн. Хутчэй нават наадварот, мэта – акрэсліць некалькі праблем, з якімі мы сутыкаемся падчас уласнай дзейнасці анлайн. Гэта тое, што можна зразумець як «сеткавую сацыяльнасць» [4]. Калі частка нашага сацыяльнага жыцця выдзяляецца з рэальнасці і пераносіцца ў віртуальную прастору. Замест вывучэння скарбаў сусветнай культуры мы ўсё больш удзяляем часу і ўвагі «альтэрнатыўным» культурным практыкам. У выніку чаго мемы і дэматыватары прываблiваюць карыстальнікаў значна больш, чым класічнае мастацтва. Часам мы ўжо можам і не ведаць, як выглядае арыгінал.

Такім чынам, увага дадзенага артыкула будзе прысвечана тром пунктам: ідэнтычнасці, спажыванню і ўласнасці.

*Ідэнтычнасць* – гэта пошук адказу на пытанне: хто мы? Пакажы мне свой дом і скажу табе, хто ты. Кажучы пра нашу сённяшнюю дзейнасць, то калі мы знаёмімся з чалавекам, якога ніколі раней не бачылі, ёсць верагоднасць, што мы проста «загуглім» і пашукаем звесткі аб гэтай асобе ў сацыяльных сетках, каб даведацца, што гэта за чалавек. Фактычна мы складаемся з нашых акаўнтаў, якія з'яўляюцца вонкавымі ў дачыненні да нас. Гэта мы і не зусім мы. Часам мы гэта робім асэнсавана і мэтанакіравана, а часам проста таму, што ўсе так робяць. Замест клопату пра змест камунікацыі мы ўключаемся ў яе сімуляцыю і рызыкуем патрапіць у становішча, калі ўся

камунікацыя ператвараецца ў набор мемаў. Колькасць часу, якую мы ўкладаем у сваю прысутнасць анлайн, можа павялічвацца амаль да бясконцасці. Але які ў гэтым сэнс? Што гэта кажа пра нас? Ці дапамагае калекцыя мемаў ці іншых выяў у нашых альбомах патлумачыць іншым, хто мы і навошта мы гэта робім? Ці можам мы стварыць у Інтэрнэце ідэнтычнасць, якая будзе абсалютна іншай у параўнанні з тым, кім мы з'яўляемся. Ці значыць гэта, што ў Інтэрнэце мы ў любым выпадку ствараем сваю адзіную і непадзельную ідэнтычнасць? У нас можа быць неабмежаваная колькасць акаўнтаў, але гэта ўсё роўна будзем не мы.

Што мы робім у анлайне? Мы ствараем разнастайную, рознабаковую адзіную ідэнтычнасць ці мы здольны быць множнымі, распыленымі, фрагментарнымі. Гэта пытанне, адказ на якое не вызначаны дакладна. Для творчага чалавека плённа і карысна мець шмат розных ідэнтычнасцей, для карпарацый накшталт Google неабходна ведаць дакладна, хто вы, каб больш эфектыўна паказваць вам рэкламу. Гэта магчыма зразумець як супярэчанне.

Што мы робім у анлайне, ці робім мы гэта для сабе ці для іншых? Адказ на гэта магчыма зразумець, калі мы рэфлексуем адносна ўласнай рэакцыі на тое, калі мы не атрымоўваем доўгачаканых лайкаў, каментароў і рэтвітаў. Што нас можа расчараваць? Недахоп сапраўднай афлайнавай цеплыні, камунікацыі, жыцця, ці нам не стае ўвагі ў віртуальнай прасторы. Нам трэба больш віртуальных «дотыкаў», бо гэта ўплывае на нас, на тое, як мы адчуваем сябе, наколькі мы ўпэўнены ў сабе, на знешні выгляд, на ўнутраную ўпэўненасці.

Гартанне стужкі ў сацыяльных сетках – гэта просты прыклад спажывання. Мы не пераасэнсоўваем гэту інфармацыю, проста не паспяваем, а ставім лайкі і гартаем далей. Мы на паверхні, няма магчымасці зазірнуць у глыб. Сярод гэтай візуальнай інфармацыі, якая павялічваецца ў геаметрычнай прагрэсіі, ці можам мы зрабіць нешта, што будзе распавядаць пра нас?

Леў Мановіч піша пра «інстаграмізмы» [3], як пра мову ці стыль крэатыўнага класу. Інстаграмізмы – гэта не толькі пра Instagram, колькі пра наша сутыкненне з візуальным, да якога не прывязаны аніякі тэкст. Няма дадатковай тэкстуальнай падказкі, як і што зразумець. Сэнс не змяшчаецца ў візуаль-



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ным, а ў нашым узаемадзеянні з ім. Фактычна як мы ствараем сабе. Пэўная колькасць нашых віртуальных прафайлаў і ўтвараюць наш аўтапартрэт. Пытанне, дзе мы больш сапраўдныя, шчырыя і адкрытыя: у віртуальнай прасторы ці ў афлайне, застаецца адкрытым, у тым ліку і да самавыяўлення асобы.

*Спажыванне*. Сёння, калі грамадства спажывання ўжо ўтварылася і паспяхова дзейнічае як глабальная з'ява, камунікацыя можа быць уключана ў логіку спажывання. Спажыванне не адбываецца раптоўна, нечакана ці выпадкова. Калі мы збіраем грыбы ў лесе, то не ведаем, што мы знойдзем. У выпадку спажывання мы выпрацоўваем пэўныя алгарытмы, паслядоўнасці, якія ўплываюць на тое, кім мы з'яўляемся. Магчыма казаць пра «алгарытмічную ідэнтычнасць» [1]. Разгледзім паслядоўнасць нашых дзеянняў. Кожны дзень мы не шукаем новыя сайты для наведвання, для кожнага з нас ёсць дзесяць сайтаў, якія мы адкрываем кожны дзень. Ёсць дзеянні, якія мы робім кожны дзень, з чаго складаецца наша штодзённасць, але яна, у сваю чаргу, як алгарытм, вызначае, хто мы. Алгарытмы выдатна працуюць, калі яны дапамагаюць нам навучыцца чаму-небудзь. Напрыклад, калі мы вучымся збіраць кубік Рубіка. Крок за крокам мы засвойваем пэўную тэхналогію спажывання. Але алгарытмы маюць і адмоўны бок. Калі наша дзейнасць у віртуальнай прасторы робіць нас бачнымі, – бачнымі для карпарацый і не толькі. Калі мы з'яўляемся больш самастойнымі, тое што мы робім у віртуальнай прасторы, больш не з'яўляецца нашым, дакладней, мы не можам гэта кантраляваць. Гісторыя пра Э. Сноўдэна як добрая ілюстрацыя гэтай праблемы. У вядомай карыкатуры 1993 г. The New York Times адзін сабака кажа другому: «У Інтэрнэце ніхто не ведае, што я сабака». Сёння мы разумеем, што гэты час прайшоў незваротна. Наша стаўленне да пытання – самарэалізацыя ці самавыяўленне – не можа пазбягаць пытання прыватнасці, ананімнасці. У XIX ці ў XX ст. было магчыма напісаць раман і выдаць яго пад псеўданімам, і ніхто не ведаў, хто гэта. У Інтэрнэце мы можам абраць сабе нік, але вельмі складана застацца ананімным на доўгі час.

*Уласнасць*. Мы карыстальнікі, таму што карыстаемся пэўнымі сэрвісамі, але мы і стваральнікі, бо нешта ствараем. У нас складаецца ўражанне, што мы ў віртуальнай прасторы ствараем сябе. І ўзнікае пытанне: дык мы хто? Дж. Фэйрфілд у ар-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

тыкуле «”Лічбавыя сяляне”: як Інтэрнэт рэчаў вяртае чалавецтва ў Сярэднявечча»: «Чалавек не валодае сваёй тэхнікай, а толькі карыстаецца рэчамі, якія злучаны з Інтэрнэтам» [2]. Шмат чым мы карыстаемся, але мы гэтым не валодаем. Мы ігнаруем умовы выкарыстання (Term of service), калі мы рэгіструемся, то «клікаем» і «пагаджаемся» з імі. Але ці чытаем і пагаджаемся? Нам проста патрэбна там зарэгістравацца, таму нас не цікавяць умовы. Фактычна нам дазваляецца выкарыстоўваць сэрвіс, але няма права нешта змяняць у ім. Напрыклад, што мы можам зрабіць з мабільным тэлефонам? Настроіць застаўку, рынгтон, але не маем магчымасці самастойна і радыкальна трансфармаваць гэтую рэч. Мы толькі спажываем, без права на трансфармацыю. І гэта ў пэўным сэнсе вяртае нас да часоў Сярэднявечча, калі ўся зямля належала манарху, які надзяляў ёй феадалаў, якія, у сваю чаргу, дазвалялі сялянам гэтым карыстацца. Сёння ёсць Інтэрнэт і буйныя карпарацыі, якія дазваляюць нам карыстацца некаторымі сэрвісамі.

Для творчых людзей гэта праблема трансфармуецца ў сітуацыю, калі мы маем права нешта ствараць, але вынік нашай працы нам не належыць. І як вырашыць гэтую праблему зараз, здавальняючага адказу няма. Не карыстацца Інтэрнэтам – гэта не выйсце.

Падсумоўваючы, варта адзначыць, што ў нас ёсць магчымасць ствараць нашу ідэнтычнасць як ілюзію (бачнасць) у вачах іншых, што будзе з'яўляцца вынікам працэсу самавыяўлення. Але з іншага боку, мы не можам кантраляваць гэты працэс, калі мы толькі карыстальнікі. Кантролю за тым, што мы робім, і вынікам нашай працы ў нас, на вялікі жаль, няма. Гэта датычыць не толькі аўтарскіх праў, але варта разглядаць і ў больш шырокім кантэксце тэхналогіі і творчасці.

1. *Cheney-Lippold, J.* Jus Algoritmi: How the national security agency remade citizenship / J. Cheney-Lippold. International Journal of Communication, 10. – 2016. – P. 22.

2. *Fairfield, J.* The ‘internet of things’ is sending us back to the Middle Ages [Electronic resource] / J. Fairfield // The Conversation. – 2017. – Mode of access : URL: https://theconversation.com/the-internet-of-things-is-sending-us-back-to-the-middle-ages-81435.

3. *Manovich, L.* Instagrammism and contemporary cultural identity [Electronic resource] / L. Manovich. – Mode of access : http: //manovich.net/



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

index.php/projects/notes-on-instagrammism-and-mechanisms-of-contemporary-cultural- identity.
4. *Wittel, A.* Toward a Network Sociality / A. Wittel // Theory, Culture & Society. – 18 (6) – 2001. – P. 51–76.

# ОРГАНИЗАЦИЯ БИБЛИОТЕЧНОЙ СРЕДЫ ДЛЯ ЛИЦ ПОЖИЛОГО ВОЗРАСТА

***Н. Е. Петушко,***
*кандидат педагогических наук, доцент кафедры межкультурных коммуникаций Белорусского государственного университета культуры и искусств*

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Одним из актуальных аспектов социально-педагогического сопровождения лиц пожилого возраста является создание соответствующей их возможностям, поддерживающей и стимулирующей процесс социализации библиотечной среды. Интерес к данному вопросу связан с распространением в библиотечной практике идей средового подхода. Его включение в проблематику библиотековедения стимулируется исследованиями по изучению влияния окружающей среды на человека в психологии, медицине, экологии, педагогике, архитектуре и других дисциплинах, которые изучают восприятие человеком окружающей среды, его поведение в разных условиях, ставят вопрос о качестве среды вокруг человека и его праве на качественную среду. Немаловажная роль принадлежит идеям Н. А. Рубакина о психологических, пространственно-временных элементах книжного дела [8] и архитекторов о средовых характеристиках библиотечных зданий. Проблематика последних стимулировала разработку темы библиотечного пространства [1; 6]. Качественно новое рассмотрение темы библиотечной среды связано с информатизацией общества [3; 9; 14]. Существенный вклад в разработку проблемы внесла М. Я. Дворкина. Развивая и дополняя концептуальные положения, выдвинутые исследователями, она впервые теоретически обосновала вопросы организации библиотечной среды; определила соотношение понятий «библиотечная среда», «библиотечное пространство», «информационное пространство»; рассмотрела социокультурный, информационный, экологический, технологи-